УДК 821.161.3.09Липский: 2-12

# *АГОНЬ ІМКНЕЦЦА ЎВЕРХ, ДУША – ДА НЯБЕСНЫХ ВЫШЫНЬ...* УЛАДЗІМІР ЛІПСКІ. "ПАМІЛУЙ І ЎЗВЫСЬ МАЛІТВЫ"

**Бароўская Ірына Анатольеўна**
Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (г. Гомель, Беларусь)

*У артыкуле аўтар знаёміць са зборнікам паэта Уладзіміра Ліпскага. Сучаснага чалавека немагчыма прадставіць без рэлігійных асноў, што выступаюць нормай хрысціянскага жыцця. У артыкуле прадстаўлена пазіцыя-разважанне, роздум аўтара зборніка, што вызывае, безумоўную цікавасць і выступае мэтай даследавання.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сур'ёзная літаратура, мастацтва, калі сваёй мэтай ставяць спыніцца, задумацца, паразважаць, абавязкова існуюць у цеснай сувязі з рэлігіяй. У беларускай літаратуры мыназіраем шмат глыбокіх аўтараў, якіх хочацца чытаць, з творамі якіх хочацца думаць і задумвацца аб сутнасці нашага зямнога жыцця. Амаль кожны беларускі паэт у розныя гістарычныя перыяды звяртаўся да Бога з пэўным маленнем (Я. Купала, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, С. Грахоўскі і шмат іншых).

Прадметам нашага даследавання з'явіўся зборнік Уладзіміра Ліпскага "Памілуй і ўзвысь (малітвы)", у які ўвайшлі 33 аўтарскія малітвы з вышыні ўзросту паэта, яго вопыту, і якія ўтрымліваюць глыбокі роздум аб нашым штодзённым жыцці.

У свой час нямецкі філосаф, крытык, філолаг Фрыдрых Ніцшэ у сваёй працы "Па той бок дабра и зла" адзначыў: "Разам з сілай духоўнага бачання і прадбачання чалавека расце далечыня і як бы прастора вакол яго: яго сусвет становіцца глыбей, яго вачам адкрываюцца ўсё новыя зоркі, усё новыя загадкі і вобразы" [1, с. 11]. Уладзімір Ліпскі ў такім ключы і пачынае сваю першую малітву:

*Святы Божа, моцны і несмяротны!*
*З гадамі ўсё выразней чую*
*Твой поклічны голас,*
*Усё даверлівей раблю крок*
*Да спазнання вечнасці* [2, с. 6].

З кожным годам паэт адчувае сябе не рабом Госпада, а *паслухмяным дзіцем.* Жыццёвая мудрасць прыводзіць да высновы, что *чалавекам* робіць чалавека *дабрыня, надзея, любоў, Памножаныя на Божую ласку.* І толькі цяпер, адчуваючы *спазнанне вечнасці*, паэт пачынае ачуваць малітву як размову душы з Богам. Для паэта малітва – гэта *голас любові, аднаўлення сэрца і скарачэння шляху паміж зямлёй і небам.* У духоўным свеце лічыцца, што галоўны змест малітвы – накіраваць душу хрысціяніна на размову з Богам, ачысціць яго сэрца ад грахоў і пабудзіць пакаяльныя думкі. Славуты свяціцель Лука Крымскі пісаў так: "Як засыхае расліна без вады ў сухой глебе, так засыхае і душа чалавека, калі не сілкуецца малітвай" [3, с. 140]. І згаджаемся з паэтам, калі чытаем такія радкі:

*Я паверыў:*
*Лепш спадзявацца і верыць,*
*Каяцца і маліцца,*
*Чым заставацца ў роспачы* [2, с. 7].

Кожны радок у зборніку – кніга жыцця, да высноў якой хтосьці дайшоў зараз, хтосьці яшчэ на гэтым шляху. Але ўсе мы разумеем, что Ойча наш дарue нам часам, але мы *не цэнім гэтага даравання* і *не схіляемся ў малітве.* І ведаем, што нельга схавацца ад часу, ад Госпада. Паэт сумуе ад таго, што чалавек не равумее сваёй грахоўнасці, заклікае *станавіцца на калені* і маліцца *за сябе, за іншых, за ворагаў* [2, с. 9]. У адной з аўтарскіх малітваў гучыць глыбокая сентэнцыя "Nosce te ipsum". Чалавек не нараджаецца такім, якім ён становіцца. Усё жыццё мы спазнаем прыроду, навуку, мастацтва і іншае, але аказваецца, спазнаць неабходна, найперш самога сябе!

*Я імкнуўся зарабіць грошай,*
*Каб упрыгожыць сваё цела.*
*Аказваецца, усе колеры прыгажосці*
*Ў духоўным багацці* [2, с. 10].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праз увесь зборнік праходзіць паняцце дабрыні – *самай надзейнай вопраткі* [2, с. 11]. Прыкметай духоўнага ўзвышэння выступае дабро: *Божа, навучы палюбіць дабро,.. І зло робіць дабро, калі яно памірае…. Дай, Божа, нам веру ў добрыя справы – яны ўмацуюць нашу дабрыню… Усё добрае – вечнае…*

Уладзімір Ліпскі раскрывае яшчэ адзін магутны падмурак хрысціянскага жыцця: *Навучы, Божа пераадольваць нягоды, страх, няшчасці, буры… Госпадзе! Выпрабуй мяне, маё сэрца…* [2, с. 34]. Нездарма, асабісты цяжкі жыццёвы шлях Лукі Крымскага дазволіў яму выказаць такія словы: “Я палюбіў пакуты, якія так дзіўна ачышчаюць душу” [3, с. 3]. Пакуты – гэта ачышчэнне, праз пакуты Хрыста прыйшло выратаванне чалавецтва: *Грахоўнасць наша ў тым, што мы незаўсёды цэнім Твой подзвіг* [2, с. 26]. Бог ёсць любоў, і каб сустрэцца з гэтай любоўю неабходна аднаўляць сваю душу штодзённай малітвай, якая і стварае ў нас энергію жыцця.

Такім чынам, аналізуемы зборнік выступіў павучальнай кнігай, якая яшчэ раз звярнула ўвагу чытача да асноў чалавечага жыцця, да сэнсу і шляхоў выратавання душы, каб напоўніць зямны шлях чалавецтва малітвай, дабрынёй і любоўю.

## Літаратура

1. Ницше, Ф. По ту сторону добра и зла; Казус Вагнер; Антихрист; Ecce homo: Сборник / Пер. с нем.; Худ.обл. М. В. Драко. – Мн.: ООО “Попурри”, 1997. – 544 с.

2. Ліпскі, У. Памілуй і ўзвысь *малітвы* / Уладзімір Ліпскі. – Мінск : “Адукацыя і выхаванне”, 2020. – 79 с.

3. “Я полюбил страдание, так удивительно очищающее душу”. Год со святителем Лукой Крымским. Православный календарь на 2014 год / Сост. Анатолий Плево. – М. : Местная религиозная организация Православный приход храма Святаго Духа сошествия на Лазаревском кладбище гор. Москвы Московской епархией Русской Православной Церкви (Издательство Сестричества во имя святителя Игнатия Ставропольского), 2013. – 368 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова